# Эсэ “Бераг маёй мары – мая родная зямля”

Русан Лізавета, 10 клас

У чысціні азёр, у хвалях рэк , у шэпце лістоты маладых бяроз я чую аповед пра цудоўную гісторыю маёй малой Радзімы. Прыгожыя акуратненькія дамы, царква на ўзгорку, працавітыя людзі, што ўпрыгожваюць зямлю тварэннем сваіх рук. Калі птушкі пачынаюць спяваць з раніцы, душа трапешчыцца ад асалоды. Пад спеў птушак прыходзяць мары аб тым, што я сама шмат чаго магу зрабіць для сваёй роднай зямлі, каб яшчэ лепш жылося маім землякам. Радасна ад таго, што мне прыйшлося нарадзіцца на слаўнай зямлі, што мне ёсць чым ганарыцца, ёсць свае каштоўнасці, якія трэба берагчы, як самы найдаражэйшы скарб.

З самага ранняга дзяцінства перад маімі вачамі паўстаюць купалы Турэцкай Свята Пакроўскай царквы. Узнікае такое адчуванне, што царква сустракае ўсіх, хто едзе з Мінска або ў Мінск. Памалу яна праплывае ўслед, і яшчэ доўга-доўга відаць яе абрысы. Лічу яе сімвалам маёй малой Радзімы, так як і людзей, якія жывуць тут доўгія гады, памятаюць усё адзін пра аднаго, захоўваюць сваю гісторыю.

У марах і думках я заўсёды знаходжуся побач з сваімі слаўнымі землякамі, хачу навучыцца так, як яны, адчуваць цану таму, што заходзіцца блізка, адчуваць адказнасць за лёс аграгарадка, за яго будучае. Хачу застацца тут назаўсёды, і тым быць шчаслівай. У душы жыве ўпэўненасць, што толькі на Радзіме можна здабыць душэўны спакой і радасць, таму што жыццё, працу прысвяціў аднавяскоўцам, сваёй зямлі. Яны так і крочаць па жыцці разам са мной, мае землякі, чыё працалюбства, талент, сардэчнасць прызываюць маю душу памятаць іх, захапляцца іх кожнадзённымі подзвігамі.

Часам перачытваю старонкі маёй любімай аповесці “Сірочы хлеб” пісьменніка Беларусі Янкі Брыля і ўспамінаю аповед мамы пра сустрэчы з гэтым цудоўным чалавекам. Мама ўспамінала, як часта прыязджаў пісьменнік у сваю родную вёску Загор’е, збіраў у вольны час дзяцей каля сябе і з

захапленнем расказваў пра сваю родную школу ў недалёкім мястэчку Турэц. Ціха гучыць мамін голас: “Чытай уважліва старонкі аповесці, дачушка. Тут Янка Брыль расказаў пра сваю любімую настаўніцу. У заходнебеларускім мястэчку, у далёкі даваенны час ва ўмовах захопніцкай Польшы, яна вучыла маленькіх беларусаў чытаць і па польску, і па беларуску, прыцягваючы да сапраўднай прыгажосці і багацця двух культур. Праз многа гадоў пасля заканчэння сямігодкі пісьменнік Янка Брыль, будучы ў Польшы, наведаў сям’ю сына Марыі Пранеўскай Юрэка. Яго бацька быў дырэктарам Турэцкай сямігодкі. На жаль, настаўнікі загінулі ў гады вайны ў Калдычэўскім лагеры…”

Няма сёння сярод нас пісьменніка Янкі Брыля – майго знакамітага земляка. А слова яго жыве. І хочацца быць упэўненымі ў тым, што агеньчык думак пісьменніка будзе саграваць нас заўсёды.

Каль я вучылася ў чацвёртым класе, настаўніца, былы завуч школы Ірына Фёдараўна Коршун падаравала мне свой альбом, дзе занатоўвала на працягу жыцця цікавыя запісы аб сустрэчах з людзьмі, аб незабыўных падзеях мінулага. На першай старонцы альбома я прачытала словы і ўбачыла подпіс ужо знаёмай мне настаўніцы Марыі Пранеўскай: “Перакладваючы лісты, успамінай мяне і мае словы да цябе…” Ірына Фёдараўна берагла гэты альбом усё жыццё, цяпер ён знаходзіцца ў школьным гісторыка-краязнаўчым музеі.

Вельмі часта на вуліцах нашага аграгарадка сустракаюся з інтэлігентным пажылым чалавекам. Гэта мясцовы мастак, краязнаўца Павел Аляксеевіч Абадзінскі. Ён сустракаецца з школьнікамі, расказвае ім аб гісторыі Турца, аб подзвігах Турчан у гады Вялікай Айчыннай вайны і пасля вайны, ужо на працоўным фронце. Павел Аляксеевіч падараваў нашаму музею свае карціны, на якіх адлюстраваны выявы старажытнага Турца, архітэктурныя помнікі 19 стагоддзя і сучасны Турэц – абноўлены аграгарадок з шырокімі светлымі вуліцамі. Па карцінах гэтага мастака можна вывучаць гісторыю сваёй малой Радзімы. З вялікай цікавасцю слухаю, як апавядае краязнавец аб творчасці пісьменніка Анатоля Дзеркача, што нарадзіўся ў Турцы; аб жыцці Янкі Маўра ў той перыяд, калі ён жыў і працаваў у мястэчку Турэц. Менавіта тут нарадзіўся

яго сын, будучы Герой Сацыялістычнай працы Фёдараў Фёдар Іванавіч. І зноў я мару, мару быць падобнай да сваіх землякоў, акунуцца ў іх дабрату, у іх бязмежную любоў да сваёй роднай зямлі.

А на Паштовай вуліцы аграгарадка Турэц прайшлі дзіцячыя і юнацкія гады сусветна вядомага спевака Пятра Конюха. Яго голас закранаў душы мільёны людзей на ўсёй планеце. На жаль, так склаўся лёс, што не гучалі яго песні на роднай зямлі. Але ж памяццю, сэрцам ён заўсёды быў разам з сваёй Радзімай.

Частым госцем Турца і ўстановы адукацыі з’яўляецца вядомы вучоны ў свеце эксперыментальнай біялогіі раслін Мікалай Афанасьевіч Ламан. Ён напісаў кнігу, прысвечаную гісторыі Турца і Турэцкай школы “Крыніцы разумнага, добрага, вечнага”. Ён заўсёды звяртае ўвагу нас, сучасных вучняў, на тое, што трэба ганарыцца сваімі мясцінамі, быць назаўсёды прывязанымі да іх і працаваць у будучым як на карысць краіны, так і на карысць сваёй маленькай Радзімы.

Бераг маёй мары – родная зямля. Тут незвычайным спевам будзяць мяне кожную раніцу птушкі, тут згадваю вобразы маіх слаўных продкаў, гледзячы на высокія царкоўныя купалы. А воблакі плывуць па нябёсах у бязмежную далеч, накіроўваючы мае думкі ў будучыню, якая будзе звязана навек з мясцінамі, дзе я нарадзілася.